*Статья подготовлена при финансовой поддержке МО Республики Беларусь по договору № 1410/2021 от 22.03.2021 г.*

Литература

1. Бункевич, Н. С. Фестивали национальных культур как средство презентации традиционной кухни (на примере города Минска) / Н. С. Бункевич // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. арт. / НАН Беларусі, Цэнтр дослед. беларус. культуры, мовы і літ. ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2018. – Вып. 24. – С. 234–239.
2. Гавриловец, Л. В. Этническое самосознание национальных общностей белорусско-польско-украинского пограничья / Л. В. Гавриловец // Диалог культур в глобализирующемся мире : материалы IV Всерос. науч.-практ. конф. (с междунар. участием) / под ред. В. Э. Манаповой, Р. М. Абакаровой. – Махачкала, 2021. – С. 24–26.
3. Калитина, А. Как дома, но с украинским колоритом / А. Калитина // Белгазета: информ.-аналит. еженедельник. – 2005. – № 29 (497). – 25 июля. – Режим доступа: http://www.belgazeta.by/ru/2005_07_25/sexus/10039/. – Дата доступа: 17.04.2023.
4. Кочеткова, И. Польская кухня: родственница белорусской, но не сестра близнец! / И. Кочеткова // Комсомол. правда. – 2013. – 24 окт. – Режим доступа: https://www.kp.ru/daily/26150.3/3038977/. – Дата доступа: 17.04.2023.

УДК 1(476)

# ФІЛАСОФСКАЯ ДУМКА І ЖЫЦЦЁ ІГНАТА АБДЗІРАЛОВІЧА

**В. В. Мельчанка, М. С. Захаранка**

*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. В. Сухога», Рэспубліка Беларусь*

Навуковы кіраўнік А. Ю. Савенка

*Разгледжаны жыццё і творчасць Ігната Канчэўскага (Абдзіраловіча) – аўтара знакамітага эсэ «Адвечным шляхам».*

**Ключавыя словы:** Ігнат Канчэўскі, Ігнат Абдзіраловіч, гісторыя беларускай філасофіі.

# PHILOSOPHICAL THOUGHT AND LIFE OF IGNAT ABDIRALOVICH

**V. V. Melchenko, M. S. Zakharenko**

*Sukhoi State Technical University of Gomel, the Republic of Belarus*

Science supervisor A. Yu. Savenko

*The life and work of Ignat Kanchevsky (Abdiralovich), the author of the famous essay «Eternal way», is examined.*

**Keywords:** Ignat Kanchevsky, Ignat Abdiralovich, history of Belarusian philosophy.

Аснова светапогляднай і жыццёвай пазіцый Ігната Канчэўскага (Абдзіраловіча) – адданасць беларускай справе, любоў да Айчыны, самаадданая праца на карысць народа. У філасофскім эсэ «Адвечным шляхам» (1921 г.) ён раскрыў драматызм гістарычнага лёсу беларусаў, іх імкненне захаваць незалежнасць свайго духу. Абдзіраловіч сцвярджаў, што «ваганні паміж Захадам і Усходам і шчырая непрыналежнасць ні да аднаго, ні да другога з'яўляецца асноўнай прыкметай гісторыі беларускага народа» [1, с. 9]. Галоўнай мэтай народа лічыў дзяржаўную незалежнасць, разглядаў яе як агульначалавечы ідэал. Адным з галоўных перашкод лічыў бюракра-

тычную сістэму дзяржавы і дух «канцыляры». Цывілізаваны шлях вырашэння грамадскіх праблем бачыў у вольнай творчасці, негвалтоўных формах сацыяльнага аб'яднання людзей, у выбары «трэцяга, сялянска-рамеснага шляху свабодных брацтваў і кааперацый – паміж дзікім капіталізмам і тыранічным сацыялізмам» [1, с. 36–43].

Вершы Ігнат Канчэўскі друкаваў пад псеўданімамі Ігнат Абдзіраловіч, Ганна Галубянка. Паэтычная творчасць вызначаецца філасофскай пранікнёнасцю ў сутнасць народнага жыцця, спалучэннем прыгажосці беларускага слова з нацыянальным светапоглядам, любоўю да чалавека, верай у адраджэнне і будучы росквіт Радзімы [2, с. 141].

Да біяграфіі звернемся толькі ў частцы адукацыі і далейшай працы паэта. І. Канчэўскі скончыў Віленскае рэальнае вучылішча (1913 г.), вучыўся ў Пецярбургскім тэхналагічным інстытуце, але дакладныя навукі расчаравалі паэта і ён пераве́ўся на гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага ўніверсітэта (1913–1916 гг.). Служыў у войску, пасля службы вучыўся на вышэйшых кааператыўных курсах пры універсітэце імя А. Л. Шаняўскага (Масква, 1917 г.). Універсітэт быў эксперыментальным. Пры паступленні не патрабавалі дакументаў аб адукацыі, не было зацверджанай вучэбнай праграмы. Пры гэтым менавіта тады паэт пазнаёміўся са святлом нацыянальнай інтэлігенцыі. Працаваў у розных кааператыўных установах у Вільні і ў Смаленску. З 1919 г. – у Мінску, працаваў у Саўнаргасе, у Цэнтральным Саюзе спажывецкіх таварыстваў Беларусі. У лістападзе 1919 г. І. Канчэўскі займаў пасаду кіраўніка інструктарскага аддзела Беларускага цэнтральнага саюза спажывецкіх таварыстваў. Таму, калі на старонках «Адвечным шляхам» сустракаем дастаткова скептычнае стаўленне да практыкі савецкага будаўніцтва, то гэтыя радкі трэба разглядаць не як плён аўтарскай уявы, страх перад новым і невядомым, але як падрахунак хоць і сціплага, але рэальнага жыццёвага досведу [3, с. 17].

Відаць, акурат расчараванне ў камуністычным праекце прывяло І. Канчэўскага ў 1919 г. у Вільню, з якой звязаны апошнія гады кароткага жыцця беларускага філосафа. Апроч удзелу ў віленскім кааператыўным руху І. Канчэўскі выкладаў у Беларускай гімназіі кааператыўныя курсы, там жа вёў геаграфічны гурток і стварыў вучнёўскі кааператыў. Згодна са звесткамі У. Конана філосаф прымаў удзел у дзейнасці Беларускага навуковага таварыства. Паводле бюлетэня Цэнтральнай рады Віленшчыны і Гродзеншчыны № 1 ад 18 верасня 1919 г. быў абраны ў раду як прадстаўнік ад Саюза кааператываў. Яго імя таксама фігуруе і сярод кандыдатаў ад вёскі Дукшты Свянцянскага павета ў польскі Сейм у выбарах за 1922 г. Са «Споведзі» Л. Геніюш мы даведваемся, што Б. Тарашкевіч не толькі асабіста ведаў І. Канчэўскага, але нават даверыў яму такую небяспечную справу, як перасылка нелегальных эмігрантаў у Літву: «Янечку [мужа Л. Геніюш] Тарашкевіч направіў да нейкага Канчэўскага ў Дукштах, беларускага кааператара, які па ланцужку так перасылаў людзей. З Канчэўскім яны прагаварылі ноч напралёт, быў гэта ідэйны і вельмі разумны беларус, аднак ехаць старым шляхам было нельга, нехта ўжо данёс пра яго, і Канчэўскі направіў Янку “на вока” назад, але каб ён вылез на першай станцыі і направіўся да харошага літоўскага ксяндза, да якога даў сваяго ліста» [3, 17].

Асобна варта згадаць лёс сям’і Канчэўскіх. Бацька, спачатку сакратар Вайскова-акруговага суда, прымае сан праваслаўнага святара. Ігнат хіба не найбольш паслядоўна і глыбока сярод заходнебеларускіх публіцыстаў бароніць ідэю адметнага і мірнага шляху беларусаў, які мусіць праходзіць праз роўнааддаленую паміж камунізмам і капіталізмам і не быць прадвызначаным ніякімі палітычнымі ідэалагемамі. Родны ж брат І. Канчэўскага – Арсен – спачатку стварае з аднадумцамі Беларускую рэвалюцыйную арганізацыю і абірае шлях узброенага супраціўлення

польскім уладам, а пасля далучаецца да камуністычнага руху: з 1923 г. становіцца членам ЦК КПЗБ, з 1929 г. – членам Бюро ЦК КПЗБ. Ідэалагічнае раздарожжа, якое напаткала сям'ю Канчэўскіх, можна параўнаць хіба што з вядомым прыкладам братоў Іваноўскіх, адзін з якіх стаў палякам, другі – літоўцам, трэці – беларусам. У той жа час ёсць звесткі, што ў перакідцы і ўладкаванні ў Вільні савецкай агентуры апасродкаваны ўдзел прымала ўся сям'я Канчэўскіх [3, с. 17–18].

Магчыма, астатнія творы Канчэўскага і не адзначаны той глыбінёй і размахам думкі, як эсэ «Адвечным шляхам», але відавочна, што менавіта яны складаюць той непасрэдны кантэкст, які дапаможа нам глыбей зразумець знакаміты твор. Знаёмства з гэтым кантэкстам дапамагло б пазбегнуць некаторых памылак у інтэрпрэтацыі эсэ, напрыклад, погляду, што тут мае месца «містыфікацыя», быццам сам І. Канчэўскі не мог напісаць такі твор [3, с. 18].

Літаратура

1. Абдзіраловіч, І. Адвечным шляхам: дасьледзіны беларускага сьветагляду / І. Абдзіраловіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.
2. Калеснік, У. Фантазмы Ігната Канчэўскага / У. Калеснік // Зорны спеў: літаратурныя партрэты, нарысы, эцюды / У. Калеснік. – Мінск, 1975. – С. 139–146.
3. Новік, І. М. Апроч Абдзіраловіча: характарыстыка жыцця і творчасці Ігната Канчэўскага / І. М. Новік // Журн. Белорус. гос. ун-та. Философия. Психология. – 2019. – № 2. – С. 15–22.

УДК 1(091)(476)

# ЭСТЕТИЧЕСКАЯ СОСТАВЛЯЮЩАЯ ДИЗАЙНА

**К. А. Лавренова**

*Учреждение образования «Гомельский государственный технический университет имени П. О. Сухого», Республика Беларусь*

Научный руководитель А. Ю. Савенко

*Идея дизайн-проекта определяется тем, для кого он создается. Объект проектирования наделяется эстетическими и функциональными свойствами. Важнейшая миссия дизайнера – воспитание эстетического вкуса потребителя. Элементами эстетической составляющей дизайна являются цветовые палитры, текстуры, композиции и формы. Они повышают привлекательность объектов и увеличивают вероятность их продаж.*

**Ключевые слова:** эстетическая составляющая, дизайн, особая атмосфера, влияние цвета, эмоциональное состояние.

# AESTHETIC COMPONENT OF DESIGN

**K. A. Laurenova**

*Sukhoi State Technical University of Gomel, the Republic of Belarus*

Science supervisor A. Yu. Savenko

*The idea of a design project is determined by who it is created for. The design object is endowed with aesthetic and functional properties. The most important mission of the designer is to foster the aesthetic taste of the consumer. The elements of the aesthetic component of the design are color palettes, textures, compositions and shapes. They increase the attractiveness of objects and increase the likelihood of their sale.*

**Keywords:** aesthetic component, design, special atmosphere, the effect of color, emotional state.